Источник: **«Рэспубліка» - 2013-06-05**

# Пашпарт для дупеля

***Юлія ПАЛТАЎСКАЯ, «Р»***



**У Сусветны дзень навакольнага асяроддзя ў Смалявіцкім раёне пройдзе прыродаахоўная акцыя «Вернем рэдкім птушкам іх дом!».**

Яе ўдзельнікі прыбяруць хмызняк на зліцці рэк Гайны і Усяжы. Дзякуючы гэтаму будуць створаны ўмовы для фарміравання новых месцаў пражывання дупеля — птушкі, уключанай у Чырвоную кнігу Беларусі.

— Каб узяць пад ахову месцы пражывання дупеля, будуць аформлены пашпарты і праекты ахоўных абавязацельстваў, — гаворыць спецыяліст па сувязях з грамадскасцю праекта Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Біяразнастайнасць» Ірына Новак. — Расчыстка таксама павысіць прывабнасць гэтай тэрыторыі як месца здабычы ежы для іншых рэдкіх відаў птушак.

Ініцыятарам акцыі выступіла Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі ў рамках выканання праектаў ПРААН і ГЭФ «Біяразнастайнасць» і «Тарфянікі-2». У мерапрыемстве таксама прымуць удзел спецыялісты Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, Мінлясгаса, НАН Беларусі, прадстаўнікі Смалявіцкага раёна.

Акцыя «Вернем рэдкім птушкам іх дом!» стане адным з этапаў работ па падтрыманні біялагічнай разнастайнасці Смалявіцкага раёна.